На адной хвалі

# «ТАБЕ, РАДЗІМА, ПРЫСВЯЧАЕМ!»

**Белтэлерадыёкампанія рэалізуе шэраг эфірных і пазаэфірных тэматычных праектаў, прысвечаных 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Сярод іх асаблівае месца займае рэспубліканская музычна-патрыятычная акцыя «Табе, Радзіма, прысвячаем!» з удзелам Заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь ансамбля народнай музыкі «Бяседа».**



У рамках гэтага мерапрыемства адбудуцца творчыя сустрэчы і канцэртныя выступленні вядомага ў нашай краіне і за яго межамі калектыву. Праграму канцэрта сфарміравалі на аснове аўтарскіх твораў мастацкага кіраўніка ансамбля «Бяседа», народнага артыста Рэспублікі Беларусь Леаніда Захлеўнага. Прагучаць кампазіцыі «Прызнанне Радзіме», «З Днём нараджэння, Перамога!», «Тальянка», «Каб неба было чыстае», «Буйніцкае поле», а таксама папуры на тэмы песень ваенных гадоў і шмат іншых кампазіцый, якія характарызуюць гераізм, стойкасць і мужнасць беларускага народа, што былі праяўлены ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Плануецца, што выступленні калектыву пройдуць на вялікіх і малых сцэнічных пляцоўках ва ўсіх абласцях нашай краіны.

## ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 217

Сённяшнія кампазіцыі складзеныя вядучым рубрыкі.

№ 71



№ 71
**Белыя простыя:** c1, c3, b4, d4, a5, b6, h6 (7)
**Чорныя простыя:** f4, h4, e5, d6, f6, a7, g7, f8 (8)

№ 72
**Белыя простыя:** c1, c3, e3, g5, h6 (5)
**Чорныя простыя:** g3, b4, a5, c5, d6 (5)

№ 73
**Белыя простыя:** d4, c5, e5, g5, b6, c7 (6)
**Чорныя простыя:** b2, d2, f2, c3, g3, a5, h6, e7, f8 (9)

№ 74
**Белыя простыя:** 43, 38, 28, 23, 17, 18, дамка 6(7)
**Чорныя простыя:** 41, 44, 27, 20, 10, дамка 24 (6)

№ 75
**Белыя простыя:** 47, 41, 32, 27, 29, 30, 22, 23, 24 (9)
**Чорныя простыя:** 43, 36, 37, 40, 35, 26, 12, 14, 9 (9)

Тры наступныя кампазіцыі складзены па правілах бразільскіх шашак.

№ 76
**Белыя простыя:** a1, g1, d2, f2, c3, g3, f4, a5 (8)
**Чорныя простыя:** a3, b4, c5, h6, a7, c7, e7, g7 (8)

№ 77
**Белыя простыя шашкі:** e1, c3, e3, b4, c5, c7 (6)
**Чорныя простыя шашкі:** a3, f4, a5, g5, g7, b8 (6)

№ 78
**Белыя простыя шашкі:** c1, g1, d2, f2, c3, f4, h6 (7)
**Чорныя простыя шашкі:** h2, a3, b4, h4, a5, c5, c7, e7 (8)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

20—27 красавіка ў Турцыі праходзіла маладзёжнае першынство Еўропы па шашках-64. Чэмпіёнамі ў сваіх узростах сталі Арцём Ціханаў (Ю17) і Эя Кахно (Д11), сярэбраныя медалі выйгралі Яўген Жукоўскі (Ю20) і Яўгенія Швед (Д17), бронзавыя — Вікторыя Нікалаева (Д20), Павел Бокі (Ю14) і Марыя Атрошанка (Д11). Яшчэ 17 медалёў рознай вартасці нашы шашысты выйгралі ў бліц і ў хуткія шашкі.

13—14 красавіка ў Ляхавічах адбыўся рэспубліканскі турнір па шашках-64 памяці І. С. Прыгодзіча. Пераможцам Віктар Бялецкі (Бяроза).

З лістоў чытачоў:

«Дзякуем аўтарам і вядучаму за гульнявы матэрыял. Асабліва хочацца падзякаваць вядучаму за агляд гульнявых партый наймацнейшых гульцоў краіны на розных спаборніцтвах. Часам проста захапляешся камбінацыямі, на якіх мы вучымся самі і вучым маладое пакаленне, аматараў гэтай старажытнай гульні», — пішуць Ф. Карпей і Л. Жыхар.

**Праверце свае рашэнні**

**Выпуск № 216 ад 26.04.2024.**

№ 66 1. 22-27 2. 21:32 24-29 3. 33:24+

№ 67 1. g1-f2 a3:c1 2. c3-d4 e5:c3 3. d2:b4 a5:c3 4. e1-d2 c3:e1 5. e3-d4 c1:g5 6. d4-c5 d6:b4 7. g3- e1:g3 8. h4:h4+ (супадае з раней апублікаванай на сайце planet-ka.forum2x2.ru Р. Мацкявічус)

№ 68

1. a3-b4 a5:c3 2. e3-d4 c3:e5 3. c1:e3 f4:d2 4. g5-f6 e5:g7 5. h6:h4+

№ 69 1. f2-e3 d4:h4 [ 1...f4:h2 2. d6:f8 d4:f2 3. d2-c3 b8:d6 4. f8:g1 ]

2. d2-e3 f4:d2 3. d6:f8 b8:d6 4. f8:e1+ (фрагмент праблемы Д. Камчыцкага planet-ka.forum2x2, 12.03.2016)

№ 70 1. f2-g3 h4:f2 2. b2-c3 b4:d2 3. a3-b4 a5:e5 4. a1-b2 d6:b4 5. b2-c3 f8:d6 6. h6:a3 d2:b4 7. a3:e1+

Першымі дакладныя адказы даслалі: С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі (усе Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна).

**«Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013»**

**e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru**

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Слухаем сваё

# ЯКІЯ РАДЫЁСТАНЦЫІ ВЫБІРАЮЦЬ БЕЛАРУСЫ?

**У наш час мы маем шырокі дыяпазон крыніц інфармацыі. І прыемна канстатаваць, што радыё застаецца запатрабаваным у вялікай частцы аўдыторыі. Паводле даных медыявымярэнняў за першы квартал 2024 года сярэднясутачная колькасць слухачоў радыё па краіне складае 716 тысяч чалавек. Пра апошнія навіны радыёсферы, а таксама пра шэраг цікавых праектаў, якія рыхтуюць радыйшчыкі для сваёй аўдыторыі расказалі спецыялісты галіны падчас круглага стала «Актуальныя тэндэнцыі ў развіцці радыёвяшчання».**

— Як прадстаўнік органа-рэгулятара ў сферы радыёвяшчання, хачу адзначыць выдатную работу ўсіх нашых радыёстанцый. Нягледзячы на імклівае развіццё тэхнічнага прагрэсу, развіццё лічбавай сферы, радыё застаецца адной з асноўных і даступных кожнаму крыніц інфармацыі, — адзначыла **начальнік упраўлення электронных СМІ і інтэрнэт-рэсурсаў Міністэрства інфармацыі Аляксандра ГАНЧАРОВА.** — Адметна і тое, што кожная з радыёстанцый мае свой фірменны стыль, які пазнаеш, нават калі проста пераключаеш эфір. Сёння ў нашай краіне сфера радыёвяшчання прадстаўлена 86 радыёстанцыямі, сярод якіх 57 дзяржаўных і 29 недзяржаўных. У 2024 годзе ў нас зарэгістраваны два новыя радыёвяшчальныя СМІ — радыё «Перамога» і радыё «Шансон». Вяшчае радыё ў FM-дыяпазоне, але з улікам развіцця лічбавых тэхналогій — і ў інтэрнэце. Так, напрыклад, у Нацыянальны радыёплээр сёння ўключана 41 радыёстанцыя. Улічваючы той факт, што большую частку эфіру любой радыёстанцыі традыцыйна займае музыка, нельга не адзначыць значны рост цікавасці да беларускіх выканаўцаў. Іх кампазіцыі, дзякуючы рабоце радыё, сталі больш пазнавальнымі і папулярнымі сярод слухачоў.

Таксама спецыяліст расказала, што вядзецца прапрацоўка ініцыятывы Асацыяцыі індустрыі радыёвяшчання па стварэнні конкурсу радыёпраграм. У ходзе працяглай размовы яе ўдзельнікі абмеркавалі шэраг важных тэм і актуальных пытанняў. У прыватнасці, былі агучаны паказчыкі медыявымярэнняў па выніках першага квартала бягучага года. Як адзначыў генеральны дырэктар ЗАТ «Медыя-Вымяральнік» Уладзімір Бабцоў, аналізавалі сітуацыю па Мінску і абласных цэнтрах. На сёння сярэднясутачная колькасць слухачоў радыё па краіне складае 716 тысяч чалавек. У выбарку ўвайшлі 11 499 рэспанэнтаў. Працягласць слухання складае 3 гадзіны 44 хвіліны. Прычым жыхары сталіцы складаюць прыкладна палову (49 %) усіх слухачоў радыё. А вось калі аналізаваць партрэт сучаснага слухача, то мужчыны (52 %) і жанчыны (48 %) таксама прыкладна аднолькава аддаюць перавагу гэтай крыніцы інфармацыі. І трэцяя частка слухачоў — гэта людзі ва ўзросце 35—44 гады (34 %). Для параўнання: толькі 7 % — людзі ўзросту 15—24 гады, па 17 % аўдыторыя ўзроставых дыяпазонаў 55—64 і 25—34 гады. Звычка слухаць радыё на працы ёсць у 46 % аўдыторыі, 35 % робяць гэта ў аўтамабілі, 18 % — дома, а астатнія — на свежым паветры, у грамадскім транспарце ці ў іншых месцах. Адпаведна, выкарыстоўваюцца для гэтага радыёпрыёмнікі, аўтамагнітола ці інтэрнэт.



Што датычыцца паказчыкаў папулярнасці сярод радыёслухачоў той ці іншай радыёстанцыі, то, паводле сярэднесутачнага ахопу, у топ-4 увайшлі: «Новае радыё», «Гумар-FM», «Юністар» і «Радыё Рокс».

Падзяліліся прадстаўнікі радыёстанцый і некаторымі планамі, якія збіраюцца рэалізаваць у найбліжэйшай перспектыве. Вядома, у радыёэфіры ёсць і працягваюць з'яўляцца разнастайныя праекты, прысвечаныя 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Так, напрыклад, «Радыё Магілёў» пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі з красавіка і да канца года рэалізоўвае праект «Жывыя радкі пра вайну» (дарэчы, у яго ёсць і відэаверсія), дзе радыйшчыкі знаёмяць сваю аўдыторыю з празаічнымі і паэтычнымі творамі беларускіх пісьменнікаў, якія былі ўдзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны. Яшчэ ў эфіры радыёстанцыі з вясны і да ліпеня штодня гучаць песні ваенных часоў. І такога роду праекты, рубрыкі рыхтуе для сваіх слухачоў кожнае радыё.

Цікавы праект збіраецца рэалізаваць «Душэўнае радыё» на сёлетнім «Славянскім базары ў Віцебску». У ноч з 11 на 12 ліпеня там плануюць правесці танцпляцоўку з удзелам беларускіх і замежных артыстаў. А вось у верасні радыё запрашае сваю аўдыторыю на «Душэўны фестываль», які будзе складацца з некалькіх частак. Падзеяй стане і сёлетні канцэрт «Рок-панарама» напярэдадні «Славянскага базару», які пройдзе ў суправаджэнні Сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі. Арганізатары кажуць, што аўдыторыю чакае цікавы творчы эксперымент. Таму заставайцеся ў кампаніі сваіх любімых радыёстанцый!

**Алена ДРАПКО.**